

“Для чалавека няма няшчасця жудасней рабскага лёсу” (Сафокл)

ШКЛОЎ інфо

№8 (70) чэрвень 2013

ПАЗНАВАЛЬНА-АНАЛІТЫЧНАЯ МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА

А.Стекловский

Житие наше...

Куда ни посмотри, всюду о нашем «житие» чувствуется забота государства, то бишь горячо любящих народ чиновников. Может оно так и должно быть в социально ориентированной «белорусской экономической модели», об успешности которой почему-то стали все меньше напоминать счастливым белорусам. Тут, главное, не переусердствовать. Возьмем два примера неустанной заботы власть предержащих о благополучии наших людей (простых, имеется в виду). Первый из них касается качества реализуемых населению товаров легкой промышленности малым бизнесом, в который ловко затесались индивидуальные предприниматели (ИП). При всей неоднозначности роли ИП в жизни граждан синеокой (кем только предприниматели не были - «вшивые блохи», «отморозки», некоторые из них «пятая колонна»), белорусские граждане в своем большинстве кошельками голосуют не в пользу аппетитно зевающих продавцов шкловского универмага. Кстати, попытки «ипэшников» расширить стационарные торговые места на местном рынке были вовремя пресечены местной администрацией – что ж, чиновники люди временные, пришлые, о Минске мечтающие, о населении вверенной им территории по-особому заботящиеся. В чем состоит эта забота еще вопрос (или великая местная тайна), но авторитета шкловским вертикальщикам явно не добавляющая, куда ни глянь. А вот куда ни глянь, всюду ожидается подорожание нашего «жития». В первую очередь, в частном секторе экономике (ценовым метаморфозам госпредприятий давно мир не удивляется), который, кстати, за счет конкуренции и сдерживает аппетиты государства в смысле перманентного удорожания товаров. Но виноваты ли индивидуальные предприниматели в том, что в свое время непредусмотрели возможность возникновения на просторах России, Казахстана и Беларуси Таможенного союза, призванного значительно облегчить жизнь проживающих на ней граждан? Не будем вдаваться в историю союза и подробности дней минувших, хотя конрпродуктивная жесткая политика белорусского правительства в области снабжения граждан потрепанными иномарками по дешевым ценам еще долго будет сниться не одному белорусу. Так вот, о качестве реализуемых населению импортных товаров - сейчас пришел черед *требований технического регламента Таможенного союза* «О безопасности продукции легкой промышленности», предусматривающий документальное подтверждение качества товаров. Глупость *регламента* в том, что под его действие подпадают и товары, ввозимые в Беларусь из России, которая как раз и является главной в едином таможенном пространстве. Но в чем соль *регламента* для покупателя? Попробуем разобраться: *технический регламент* требует наличия для импортируемой продукции легкой промышленности сертификата безопасности определенного стандарта Таможенного союза, что, в свою очередь, предполагает внедрение в Беларуси процедур «идентификации и сертификации» (в том числе проведение испытаний) соответствующей продукции. Это значит, что предприниматели сами должны будут предоставлять лабораториям часть товарной партии для произведения дорогостоящей экспертизы качества. При этом прошедшая через лабораторную проверку продукция будет непригодна для реализации. И это не важно, что если ИП закупает товар в России, то с товаром получает сертификат РФ, но вот дома в РБ его почему-то необходимо подтверждать, за что полагается заплатить 1 млн. 200 тысяч. Учитывая, что партии, закупаемые ИП, это 5-10 единиц товара, то данный объем оплаты в конце концов приведет

к резкому удорожанию каждой единицы продукции. Вот и выходит, что *регламент* - элементарное вымогательство денег через предпринимателей у населения. Если же ИП будет продавать товары, произведенные за пределами Таможенного союза, то должен заплатить за техническую экспертизу каждого вида продукции, а это уже совсем другие деньги. Подсчитано, что в среднем документы о соответствии техническому регламенту будут стоить от 40 до 70 миллионов для каждого предпринимателя - в зависимости от разнообразия ассортимента. Значит, все автоматически подорожает. Это отразится и на покупателях, и на объемах продаж. Единственная возможность «ипэшника» сэкономить - это «сузить» ассортимент, что также затронет интересы покупателей, но и может привести к закрытию бизнеса у 90% ИП. А это приведет к вымыванию дешевого товара, ведь государство своими непрофессиональными действиями развязывает руки монополистам, которые будут устанавливать цены, которые им понравятся ввиду отсутствия конкуренции. Кроме того, бюджет страны получит огромную брешь от того, что ИП перестанут выплачивать налоги, арендную плату, отчисления в ФСЗН. Фактически же индивидуальные предприниматели будут не в состоянии получить технические сертификаты, потому что они не являются производителями либо оптовыми торговцами. Предпринимателей возмущает, что ответственность за качество продукции и издержки по сертификации товаров этим документом перекладываются с производителей на реализаторов. Кстати, предприниматели не выступают против технических регламентов как таковых, тем более не против того, чтобы товар был безопасным, они достаточно долго работали с гигиеническими сертификатами, но и убеждены, что технические регламенты и соответствующие удостоверения должны находиться у производителя и у первых поставщиков. Предприниматели использовали все способы отстаивания своих (и наших) интересов - у них остался последний аогумент для власти - забастовка. И они уже начали бастовать – в Витебске 6 июня от 80 до 90 процентов торговых точек на рынках и в торговых центрах «Полоцкий», «Смоленский», «Эвиком», «Южный», «Чкаловский», «Привокзальный», «Континент» и «Беларусь» были закрыты. Работали только частные унитарные предприятия (ЧУП) (и то не все, некоторые также были закрыты) и точки, реализующие продукты. Таким образом они пытаются обратить на себя внимание руководства страны. И их можно понять - и денежные затраты, и вероятные очереди в центр стандартизации, где есть единственная в области лаборатория, и необходимость потерять часть товара на технические исследования, причем с неизвестным результатом, - все это предпринимателей не устраивает. И хотят предприниматели совсем не много - пересмотра условий технического регламента. Главным образом, чтобы не нужно было подтверждать качество российских товаров, или тех, которые импортируются в Россию и уже на российском пограничье Таможенного союза проходят контроль качества. Только вот слушать их вряд ли кто собирается. Но и люди сегодня не так зомбированы этой властью, как 18 лет назад. Индивидуальные предприниматели Минска и регионов Беларуси готовы не заплатить налоги, уйти в вынужденные отпуска и организовать массовые акции протеста, если технический регламент Таможенного союза (ТС) «О безопасности продукции легкой промышленности» вступит в силу 1 июля без изменений. Второй пример касается заботы чиновников уже о качестве продуктов питания. С 1 мая на территории Беларуси действуют новые правила убоя свиней (постановление Министерства сельского хозяйства от 28 января 2013 года), которое фактически привело к запрету реализации мясной продукции крестьянами на местных рынках. Постановление предусматривает организацию боен в каждом районе Беларуси (оторванный от реальной жизни, как и министр сельского хозяйства, премьер-министр Беларуси Михаил Мясникович поставил задачу иметь убойный цех в каждом агрогородке), куда живой пока товар необходимо доставить, оплатить процедуру убиения, да и на рынок уже готовая продукция должна быть доставлена без нарушений санитарных норм. Но фишка вся в том, что на территории Шкловского района вообще нет убойной площадки и для совершения процедуры убийства животного нужно его везти в Дрибин или Горки.

Даже если вы попытаетесь реализовать свинью в живом весе в местную заготовительную контору (по цене 16 000 рублей за 1 кг живого веса), то вам необходимо будет записаться в не очень длинную очередь с целью формирования группы животных-претендентов на убой. Можно, конечно, посочувствовать деревенским горемыкам, привыкшим к самообеспечиванию продуктами питания, но и путем выращивания свиней на продажу формировать определенный уровень благополучия. Впрочем, с уровнем большой вопрос – сегодня 1 кг комбикорма свиного стоит 5 700 рублей. Легким утешением цена на перловую крупу – те же 5 700 рублей, хотя сравнить технологию производства комбикорма с импортными компонентами и элементарную обдирку ячменя можно только в дурном сне или в белорусских министерствах экономики и сельского хозяйства. Ввиду несоизмеримости экономического эффекта от использования данных продуктов перерабатывающей промышленности, оставим перловую крупу пылиться в целлофановых пакетах на полках сельских магазинов. Проблема на самом деле имеет государственный масштаб – планомерно уничтожив массовое производство молока на подворьях, чиновники взялись за мясную составляющую крестьянской жизни. Ставка на крупно масштабное производство может и оправдана в тактическом плане, но стратегически… крестьянин на заготовку сена не всегда использует импортные нефтепродукты, ему не нужно платить зарплату, ему не нужен вороватый начальник на джипе, тем более на подворье не приветствуется строения за миллиарды рублей и современные технологии, в результате которых технологический период использования «высокопродуктивных» коров сведен во многих хозяйствах до 2-х лет. В свою очередь, ОАО «Александрийское» в 2013 году только на расширение молочно-товарной фермы в д.Староселье получит более 3 млрд. рублей. Раньше совершенно без инвестиций соизмеримую по качеству и объему продукцию производили 3 окружающие деревни местного сельсовета. Людям просто нужно вовремя заплатить за сданное молоко. Сегодня и сельчане, и фермеры из-за новых правил убоя значительно сокращают производство свинины, не торопятся и на рынки со своей продукцией. 9 июня автор статьи наблюдал ситуацию на шкловском рынке – цены на мясную продукцию возросли на 5 тысяч рублей, около прилавков ИП покупатели были не замечены, оптимизма в глазах продавцов тоже не наблюдалось. Предпринимательница из Витебской области вообще в шоке – такого никогда не было, что бы она в Шклове не распродала свой товар. В ближайшем переходит на реализацию продукции мясокомбинатов, а это уже иное качество и иные цены. Забота о людях превратилась в фикцию, да и можно ли все это назвать заботой? Кто скажет, что на подворье условия убоя хуже, что качество работы по обработке туши «для себя» ниже, чем на конвейере не заинтересованных в результате обыкновенных работяг? И деться белорусскому крестьянину-горемыке некуда – с 7 мая 2013 года запрет на ввоз белорусской свинины ввела Украина. Дожили…

В тему

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, что цены на ранние овощи в Беларуси выше, чем в сопредельных странах. Об этом поведал министр торговли Валентин Чеканов на заседании президиума Совета министров, сославшись на информацию МИД. По данным, которые приводит сайт правительства Республики Беларусь, на 23 мая свежие огурцы в Беларуси стоили дороже, чем в Украине (на 44%), Латвии (на 11%) и Польше (на 47%). Стоимость зеленных культур в Беларуси выше, чем в упомянутых странах на 32-82%! Также министр констатировал, что ассортимент ранних овощей и фруктов от отечественного производителя пока не может удовлетворить потребительский спрос. Чеканов предложил для повышения конкурентоспособности отечественной ранней овощной продукции провести анализ состава затрат при формировании отпускных цен, а также снизить издержки. К сожалению, не только ранние овощи в Беларуси стоят дороже, чем у соседей, но и еще ряд позиций, за которые отвечает сельское хозяйство – свинина, говядина.

Только вот проанализировать эффективность выращивания продукции на сельских подворьях в сравнении с общественным производством ума явно не достает. Или жизнь пока не заставила?

Стварэнне навучальнай установы з'яўляецца немэтазгодным

Сёлета спаўняецца 335 год стварэнню ў Шклове славутага шляхетнага вучылішча Сямёна Зорыча. Вучэбная ўстанова была створана ў Шклове ў 1778 годзе па ўзору французкай Брыенскай школы для падрыхтоўкі да вайсковай службы дзяцей-сірот шляхетнага паходжання. Праіснаваўшы ў Шклове 22 гады, вучылішча была пераведзена ў Гродна і размяшчалася ў каралеўскім замку. У далейшым, на базе гэтай навучальнай установы быў створаны першы Маскоўскі кадзецкі корпус.

У адукацыйным і гістарычным накірунку шляхетнае вучылішча ў Шклове мае найцікавейшую гістарычную спадчыну, якая павінна і надалей спрыяць ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі для будучыні Беларусі. Таму прадстаўнікі грамадскасці Шклова звярнуліся да старшыні ГА "Таварыства беларускай мовы імя Франіцішка Скарыны" спадара Алега Трусава з просьбай паспрыяць адраджэнню ў Шклове гэта яскравай гістарычнай спадчыны.

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны".

Шклоўская раённая арганізацыя

25 студзеня 2013 года Старшыні ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны"спадару Алегу Трусаву.

Паважаны Алег Анатольевіч!

Прадстаўнікі грамадскасці Шклоўскага раёна звяртаюцца да Вас з просьбай паспрыяць адраджэнню ў Шклове яскравай гістарычнай спадчыны – славутага шляхетнага вучылішча Сямёна Зорыча.

Вучэбная ўстанова была створана ў Шклове ў 1778 годзе па ўзору французкай Брыенскай школы для падрыхтоўкі да вайсковай службы дзяцей-сірот шляхетнага паходжання. Праіснаваўшы ў Шклове 22 гады, вучылішча была пераведзена ў Гродна і размяшчалася ў каралеўскім замку. У далейшым, на базе гэтай навучальнай установы быў створаны першы Маскоўскі кадзецкі корпус.

У адукацыйным і гістарычным накірунку шляхетнае вучылішча ў Шклове мае найцікавейшую гістарычную спадчыну, якая павінна і надалей спрыяць ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі для будучыні Беларусі.

Як магчымы першапачатковы варыянт, ваенна-навучальная ўстанова можа быць створана на базе існуючай гарадской гімназіі. У комплексе збудавання гімназіі ўваходзіць будынак захаваўшайся з 18 стагоддзя гарадской ратушы. Такім чынам галоўны архітэктурны брэнд Шклова спалучыцца і з гістарычнай спадчынай нашай краіны.

Прасім разглядзець нашу прапанову і выказаць меркаванні і пажаданні.

Старшыня Шклоўскай раённай арганізацыі ТБМ імя Ф.Скарыны А.Грудзіна
Сябры таварыства
П.Мігурскі, Р.Кастусёў,
М. Кучарэнка

У сваю чаргу А.Трусаў пераадрасаваў пісьмо Міністэрству адукацыі, адкуль яму даслалі наступны адказ, які мы і прапаноўваем чытачам:

21.05.2013 г. Старшыні ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны"
Трусаву А.А.

Паважаны Алег Анатольевіч!

У Міністэрстве адукацыі разгледжаны Ваш зварот, які паступіў з Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па пытанні стварэння ў г.Шклове ваенна-навучальнай установы. Паведамляем наступнае.

Спецыялістамі ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама і ваеннага камісарыята вобласці праведзена сустрэча і размова з работнікамі Шклоўскага райвыканкама, педагагічным калектывам ДУА "Гімназія г.Шклова" (далей – гімназія), членамі бацькоўскага камітэта.

Гімназія адкрыта на падставе рашэння Шклоўскага райвыканкама ад 24 жніўня 2005 г. №9-46. У гімназіі навучаюцца 315 вучняў у 22

класах. Усе вучні V-XI класаў паступілі ў гімназію, здаўшы конкурсныя іспыты. На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў гімназіі ў адпаведнасці з запытамі вучняў і іх законных прадстаўнікоў функцыянуюць класы фізіка-матэматычнага, хіміка-біялагічнага, філалагічнага напрамкаў.

Заснавальнік гімназіі – Шклоўскі райвыканкам, а таксама прадстаўнікі педкалектыву, бацькоўскай грамадскасці змены віду ўстановы адукацыі не падтрымліваюць.

Акрамя таго, у раёне адсутнічае кантынгент вучняў неабходны для стварэння ўстановы адукацыі дадзенага тыпу. На працягу апошніх двух гадоў ва ўстановы адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях ваеннага профілю для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, паступілі толькі 4 выпускнікі ўстаноў адукацыі Шклоўскага раёна.

У вобласці функцыянуе ДУА “Магілёўскае абласное кадэцкае вучылішча”. У ім навучаецца 113 вучняў, у тым ліку 4 ураджэнцы Шклоўскага раёна. Акрамя гэтага, у 60 установах адукацыі вобласці адкрыта 96 класаў ваенна-патрятычнай накіраванасці. Гэта дазваляе задаволіць запыты вучняў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх на атрыманне адукацыйнай падрыхтоўкі дадзенага напрамку.

У цэлым у рэспубліцы функцыянуюць 8 кадэцкіх вучылішчаў, у якіх навучаюцца 1480 вучняў, у тым ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, - 177 (12 працэнтаў), дзяўчат – 192 (13 працэнтаў).

На падставе вышэйпададзенага мяркуем, што ў цяперашні час стварэнне ў Шклове ваенна-навучальнай установы на базе гімназіі з’яўляецца немэтазгодным.

Намеснік міністра
В.А.Будкевіч

Адказ атрымалі, але пра гістарычнаю спадчыну Шклова ў ім чыноўнікі нічога не напісалі. Прапануем чытачам абмеркаваць магчымы далейшы лёс славутага шляхетнага вучылішча Сямёна Зорыча.

Алесь Петрусевіч

Рыгор Кастусёў

Каму на руку “камерцыялізацыя”?

“У Беларусі непрыватызаванае грамадзянамі жыллё будуць пераводзіць у камерцыйнае”, — заявіў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Шорэц, адказваючы на пытанні дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у час паседжання сесіі 17 мая. Пры гэтым міністр адзначыў, што праект указа аб пераводзе жылых памяшканняў, прадастаўленых грамадзянам па дагаворах найму, у разрад камерцыйных ужо распрацаваны, узгоднены і рыхтуецца для накіравання прэзідэнту. Выслухаўшы дадзены адказ, “народныя абраннікі” нават і вухам не павялі і не задумаліся — а для чаго гэта робіцца, ці закранаюцца тут інтарэсы беларускіх грамадзян. Бо зусім нядаўна, 2 сакавіка 2013 года ўступіў у сілу новы Жыллёвы кодэкс, які ўжо прадугледжвае ўвядзенне платы за карыстанне памяшканнем дзяржаўнага жыллёвага фонду. А сапраўды, з якой нагоды рыхтуецца новы указ, і што ён прынясе беларускім грамадзянам? Бо яшчэ не паспелі высахнуць чарнілы пасля падпісання і ўступлення ў сілу новага Жыллёвага кодэкса, а ўжо прымаюцца рашэнні, якія не адпавядаюць яго палажэнням.

На сёння ў нашай краіне налічваецца 392 тысячы непрыватызаваных кватэр, што складае каля 14% ад агульнай колькасці жылля. Частка з іх — гэта кватэры непрыватызаваныя грамадзянамі па розных прычынах, калі кошт прыватызацыі быў мінімальны. Астатнія — гэта кватэры, пабудаваныя напрыканцы 20-га і ў 21-ым стагоддзі, калі правілы прыватызацыі былі зменены. Гісторыя пераменаў і рэформаў у жыллёвай сферы распачалася ў 1991-92 гадах, з часоў падрыхтоўкі і ўвядзення ў дзеянне закона аб прыватызацыі. Да 1999 года ў Беларусі было прыватызавана каля 1 млн. кватэр. Прыватызацыя жыллёвага фонду дазволіла стварыць уласніка, забяспечыла фармаванне другаснага рынку жылля, паслужыла асноўным фактарам увядзення жылля ў

абарот як тавара. У той жа час, прыватызацыя не змагла стаць той чаканай рэсурснай базай, што неабходна была для павелічэння жыллёвага фонду краіны, як гэта планавала беларускае кіраўніцтва. Дазволіўшы прыватызацыю каля мільёна кватэр, дзяржава атрымала ад гэтага мінімальную колькасць сродкаў, якіх хапіла на будаўніцтва ўсяго толькі 1100 новых. У першую чаргу гэта было звязана з інфляцыйнымі працэсамі ў эканоміцы краіны. Бо на працягу 90-х гадоў прыватызацыя жылля, пабудаванага за савецкім часам і ў першыя гады незалежнасці, стабільна праводзілася ў коштах 1991 года, і сродкі, што паступалі ад прыватызацыі, абясцэньваліся. Згодна новага беларускага заканадаўства прыватызацыя жылля можа адбывацца толькі на платнай аснове, у коштах, праіндэксаваных да сучасных рэаліяў у сферы будаўніцтва з улікам тэрмінаў амартызацыі. У многіх суседніх краінах постсавецкай прасторы, напрыклад, у Расіі, прыватызацыя да гэтай пары адбываецца на безкаштоўнай аснове. Для прыватызацыі жылля беларускія ўлады дазволілі выкарыстоўваць атрыманыя і своечасова перарэгістраваныя чэкі "Жыллё". Але вялікай фінансавай нагрузкі гэтыя чэкі ўжо не нясуць, таму яны мала паўплываюць на кошты кватэр. Ды і маюць іх менш паловы жыхароў непрыватызаваных кватэр. Прыватызацыю ў Беларусі дазваляецца праводзіць у растэрміноўку працягласцю да 40 год, але першасны прыватызацыйны разавы ўнёсак на працягу года пасля афармлення дакументаў на прыватызацыю павінен адпавядаць 10% ад кошту кватэры. Што для грамадзян, якія пражываюць у дамах, пабудаваных у апошнія дзесяцігоддзі мінулага стагоддзя, будзе раўняцца ў эквіваленце прыкладна 1,5 тыс. долараў. Для тых, хто пражывае ў больш новых дамах, памер першаснага ўнёску з разліку за дзвюхпакаёвую кватэру ўзрасце на 0,5-1,0 тыс. долараў. Для грамадзян, якія на працягу года пасля падпісання прэзідэнтам указа аб пераводзе непрыватызаванага жылля ў камерцыйнае, не прымуць рашэнне аб афармленні дакументаў на прыватызацыю, кожны месяц будзе налічвацца арэндная плата за карыстанне ў памеры каля 50% ад рынкавага кошту арэнды жылля. Што, у залежнасці ад населенага пункту, будзе складаць ад 50 да 170 долараў. У іншым выпадку кватэры будуць пераводзіцца ў статус сацыяльных з забаронай далейшай прыватызацыі.Такім чынам беларускія ўлады, прымушаючы сваіх грамадзян паўторна аплочваць пабудаванае за іх жа кошт жыллё, імкнуцца вырашыць пытанне забеспячэння бюджэтнага фінансавання сферы будаўніцтва, куды гэтыя сродкі павінны накіроўвацца згодна беларускага заканадаўства. А гэта трыльёны беларускіх рублёў, якія часткова будуць расходаваны на будаўніцтва жылля "патрэбным" людзям, часткова будуць раскрадзены, як гэта было ў мінулыя гады. Напрыклад, толькі ў 2010 годзе ў сферы будаўніцтва, па заключэннях прадстаўнікоў праваахоўных структур, было скрадзена каля 730 мільярдаў рублёў бюджэтных сродкаў, што на той час пераўзыходзіла агульны кошт зданай ў гэты год у эксплуатацыю "Мінск-Арэны", або раўнялася кошту 60 тыпавых панэльных шматкватэрных дамоў у сталіцы… Дык што, можа "народныя абраннікі" не ведаюць аб гэтых фактах? Ведаюць, ды маўчаць, бо спадзяюцца — можа і ім штосьці перападзе. Што яшчэ прыдумаюць у хуткім часе беларускія чыноўнікі, каб працягнуць рабаўніцтва свайго народа? Пажывём, пабачым…

Читать полностью: http://naviny.by/rubrics/opinion/2013/05/23/ic_articles_410_181848/

В 1995 Александр Лукашенко в интервью немецкой газете "Handelsblatt" заявил:

"История Германии – это слепок в какой-то степени истории Беларуси на определенных этапах. В свое время Германия была поднята из руин, благодаря очень жесткой власти известного Адольфа Гитлера... Не все только плохое было связано в Германии с известным Адольфом Гитлером. Немецкий порядок формировался веками, при Гитлере это формирование достигло наивысшей точки. Это то, что соответствует нашему пониманию президентской республики и роли в ней президента... Гитлер сформировал мощную Германию благодаря сильной президентской власти... Германия поднялась благодаря сильной власти, благодаря тому, что вся нация сумела консолидироваться и объединиться вокруг сильного лидера… Глава государства – президент, его авторитет, его ведущая роль выходят на этом этапе на первое место... Этому учит нас немецкая история".

Святар Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы, айцец Андрэй Буйніч пракаментаваў для інфармацыйнага агенства “Тэлеграф” падвышаную ў апошні час увагу з боку кіраўніцтва Беларускай Праваслаўнай Царквы да “уніяцкага пытаньня”.

Ніжэй прапануем адказы святара на пытанні журналіста “Тэлеграфу”.

— Як Вы лічыце, чаму менавіта зараз у Беларускай Праваслаўнай Царкве так востра паўстала ўніяцкае пытаньне? Адкуль, на Вашу думку, сыходзіць крыніца антыўніяцкай кампаніі ў пэўных колах Беларускай Праваслаўнай Царквы ў апошнім часе: з Беларусі ці з Масквы? Ці не звязана гэта з барацьбой паміж рознымі групоўкамі ў БПЦ за ўладу?

— У гэтай справе я паспрабую выказаць толькі сваё асабістае мяркаванне ды адначасова не хацеў бы камэнтаваць унутраных праблемаў іншай Царквы. Вось чаму я хацеў бы перад усім свой адказ сканцэнтраваць вакол Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы, якая стала прадметам, так бы мовіць, “антыўніцкай кампаніі”.

Мінула больш за 20 гадоў, як уніяцкія (грэка-каталіцкія) парафіі ў Беларусі змаглі аднавіць сваю адкрытую душпастырскую дзейнасьць. За ўвесь гэты час грэка-каталіцкія душпастыры не займаліся антыправаслаўнай прапагандай. Кіраўніцтва нашай Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы мэтанакіравана будавала карэктныя і поўныя пашаны адносіны да ярархаў Беларускай Праваслаўнай Царквы і, зразумела, да праваслаўных вернікаў. І вось, раптам хтосці хоча разгарнуць антыўніяцкую кампанію. Каму гэта патрэбна і навошта? Больш таго, можна пачуць (або прачытаць) паклёпныя, беспадстаўныя закіды, што дзейнасьць Уніяцкай Царквы ў Беларусі “пагражае грамадзянскаму міру”, што мы “совращаем и завлекаем”. Ніхто разумны так не падумае і ня будзе да гэтага прыслухоўвацца, але... Дазвольце малую гістарычную рэмарку. У гэтым годзе адзначаем 1150 гадоў горада Полацка. Полацкая япархія ўсходняй (візантыйскай) традыцыі была ў сулучнасьці з Рымам. І гэтую сулучнасць з Пасадам святога Вярхоўнага апостала Пятра япіскапы беларускіх (і часткова ўкраінскіх) япархіяў аднавілі ў рамках Берасцейскай царкоўнай уніі (у 1595-1596 гады). А Усходняя Царква на нашых землях ня мела ў той час аніякага дачыненьня да Масквы. Толькі ў 1839 годзе З’яднаная (Грэка-уніяцкая) Царква была насільна падпарадкаваная Расейскай Праваслаўнай Царкве. І вернікаў ніхто не пытаў, ці хочуць ліквідацыі структураў сваёй Царквы. 20 гадоў таму ўніяты (грэка-каталікі) аднавілі адкрытую душпастырскую дзейнасьць, зарэгістравалі парафіі. Чаму ж мы ня можам несці Евангельле шматлікім грамадзянам Беларусі, якія ніколі яго ня чулі? Чаму ж мы ня можам вучыць нашых суграмадзянаў любіць Бога і нашую Бацькаўшчыну — Беларусь? Чаму ж мы ня можам прытрымлівацца ўсходняй богаслужбовай традыцыі нашых продкаў? Каму гэта перашкаджае і чаму?

Уніятам (грэка-каталікам) ніхто ня можа забраць права на існаваньне. У незалежнай дзяржаве мы ня можам і ня хочам быць грамадзянамі трэцяй катэгорыі, як можа гэта хтосці б і хацеў. Шануем іншых ды чакаем пашаны да сябе. І трэба сказаць, што дзяржаўныя структуры гэта разумеюць.

Нарэшце давайце падумаем, ці нам, уніятам, трэба “завлекать, совращать” праваслаўных вернікаў? Мы праводзім евангелізацыю сярод тых, хто ня ведае Бога. Падумайце, колькі нам трэба ўкласці працы, евангелізацыі, катэхізацыі, каб прывесці іх да нармальнай, жывой веры! Мы працуем з тымі, хто сам шукае Бога, хто сам да нас прыходзіць. Нашыя вернікі ня могуць дазволіць сабе на фармальную веру. У нас няма нармальнага храму нават у Менску, іншымі словамі “культавага будынку”. Трэба мець не малое перакананне, каб пайсці ў душпастарскі цэнтр, які мае выгляд катэджа.

— Як Вы мяркуеце, чаму для БПЦ так важна, каб Беларуская Грэка-Каталіцкая Царква ня мела ў Беларусі свайго біскупа і сваёй ерархічнай структуры? Ці не з'яўляецца гэта ўмяшаннем адной Царквы ў справы іншай? Ці сапраўды БГКЦ уяўляе нейкую пагрозу для БПЦ і праваслаўя ў Беларусі?

— Наогул сітуацыя камічная: БПЦ, якая паводле яе самой, з'яўляецца дамінуючай ў Беларусі, звяртае ўвагу на Беларускую Грэка-Каталіцкую Царкву, якая нясе служэньне ў трох дзясятках парафіяў! Мы нават не заўсёды маем магчымасьці дайсці да шматлікіх вернікаў, якія жывуць па-за нашымі парафіямі... Гэта тысячы вернікаў, за якіх мы нясем душпастырскую адказнасьць. І трэба нагадаць, што пасля гэтак званага Полацкага "сабору" (1839 году) царскі ўрад ліквідаваў дзве ўніяцкія япархіі. Гвалт з боку свецкіх уладаў ня меў і ня мае аніякай кананічнай моцы ў жыцці Царквы. Гэтыя япархіі ёсць **"перашкоджанымі"** (impeditae), але ня **"згаслымі"** (extinctae). Яны чакаюць свайго біскупа. Паводле кананічнага права памесную Царкву звычайна ўзначальвае біскуп. Закон Рэспублікі Беларусь гэтага не забараняе. Дабрасумленнаму чалавеку гэта няцяжка зразумець. А калі для некаторых праваслаўных "рупліўцаў" пагроза ў тым, што мы — беларускія грэка-каталікі стараемся беларусам (і ня толькі) дапамагаць сустрэцца з Ісусам Хрыстом, гэта проста здзіўляе. І калі яны лічаць, што яны самі ў гэтым "спецыялісты", то мне здаецца ў іх не павінна быць такога страху.

— Якое Ваша меркаванне, чаму ані Беларуская Грэка-Каталіцкая Царква, ані Рыма-Каталіцкі Касцёл у Беларусі не пратэстуюць супраць дадзенай антыўніяцкай палітыкі пэўных колаў у Беларускай Праваслаўнай Царкве? Ці варта, на Вашу думку, чакаць узмацнення антыўніяцкай рыторыкі і палітыкі пасля імавернай змены кіраўніцтва БПЦ?

— Я малюся, каб Госпад даў Беларускай Праваслаўнай Царкве новага разумнага і святога першаярарха. Разам з гэтым я ўпэўнены, што нашыя царкоўныя ўлады ня будуць апускацца на ўзровень палемікі. Апраўдвацца — гэта часта азначае быць вінаватым. Навошта нам адчуваць віну без віны? У сувязі з неабгрунтаванымі выказваннямі некаторых праваслаўных палемістаў былі апублікаваныя некаторыя афіцыйныя камунікаты, якія можна знайсці ў інтэрнэце. Мне здаецца, што гэтага дастаткова. Калі хтосці жадае запытаць кагосці з нас пра нешта (так як гэта робіце сёння Вы), то, мяркую, заўсёды можа гэта зрабіць і разлічваць на шчыры адказ. І хачу яшчэ выказаць удзячнасць усім шматлікім праваслаўным у Беларусі, якія ў апошні час засведчылі нам сваю братэрскую пашану і падтрымку. Гэта каштоўны і аптымістычны знак талерантнасці беларускага грамадства.

Паводле **Catholic.by**

Лукашенко поручил министру МВД Шуневичу "привести в чувство" строительную отрасль

Президент 10 июня сделал ряд поручений министру внутренних дел. В частности, о строительстве Президент сказал:

- Тот уровень строительства, который существует в нашей стране, абсолютно недопустим. Полная расхлябанность и разболтанность, коррумпированность. Я уже не единожды это говорил. Поэтому нужно весь пласт проблем поднять на поверхность, привести в чувство строительную отрасль, особенно чиновников, которые там заняты, и принять соответствующие меры.

Далее, по словам главы государства, необходимо изучить ситуацию в коммунальном, сельском хозяйстве и других сферах. "Без милиции эти пласты мы не поднимем. Поэтому хотелось, чтобы в комиссии, которая будет создана, были и ваши люди, и вся система МВД поработала на то, чтобы изучить и принять решение по этим направлениям. Нужен действительно серьезный анализ ситуации", - подчеркнул Президент.

Адказны за выпуск Мігурскі П.С. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад: 299 ас.
Адрас: 213018 Магілёўская в., Шклоўскі р., в.Дабрэйка. Тэл. 8 02239 92618; 8 0298 499670
E-mail: agro56@tut.by. РАСПАЎСЮД БЯСПЛАТНЫ.